

В.А.**Цюпа**.

С.Шчапаў, Фаменка, Я.Яўна; Сандар — У.Лінкевіч, К.Лосеў; Мошу — Г.Эстэрлейн, А.Касцецкі; Юлька — Ажарэльева, Л.Герасімава, Т.Брагіна; Ілона — Іванова, Н.Равінская, Курлыкова, Мазур; Міхаль — А.Прыходзька, Ю.Харытонаў). Спектакль вызначаўся рамантычным рэжысёрскім бачаннем, арыгінальнай сцэнаграфіяй, тэмпераментнай ігрой акцёрскага ансамбля.

*В.Г.Брылон.*

**ЦЭНТРА́ЛЬНЫ ДЗЯРЖА́ЎНЫ АРХІ́Ў-МУЗЕ́Й ЛІТАРАТУ́РЫ І МАСТА́ЦТВА БЕЛАРУ́СІ**, назва *Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва* ў 1976—93.

**ЦЭ́ПАВА** Галіна Іванаўна (27.3.1910, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 7.2.1985), артыстка оперы (мецца-сапрана). Засл. арт. Беларусі (1955). Скончыла Горкаўскі муз. тэхнікум (1932), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1936). У 1938—62 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Творчую манеру Ц. вызначалі сцэн. тэмперамент, разнастайнасць сродкаў для дасягнення псіхал. дакладнасці вобраза. Выконвала драм. і характарныя партыі: Ганка («Міхась Падгорны» Я.Цікоцкага), Хрысцінка («Кветка шчасця» А.Туранкова), Любаша («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Канчакоўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Любоў, Салоха («Мазепа», «Чаравічкі» П.Чайкоўскага), Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Азучэна («Трубадур» Дж.Вердзі), Часнікова («Страшны двор» С.Манюшкі), Ваня («Іван Сусанін» М.Глінкі) і інш. *Л.П.Івашкоў.*

**ЦЮ́ПА** Вячаслаў Алегавіч (н. 10.1.1955, г. Душанбе), рэжысёр. Вучыўся ў Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі (1969—71), скончыў Муз. вучылішча імя Гнесіных (1976, клас фп.), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1981). З 1981 рэжысёр-пастаноўшчык Растоўскага дзярж. т-ра муз. камедыі. З 1984 в.а. гал. рэжысёра Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі, у 1987—92 гал. рэжысёр, у 1992—98 рэжысёр-пастаноўшчык Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Для яго творчасці характэрны надзвычайная рэжысёрская фантазія, паэтычна-рамантычнае светаадчуванне, тэатральнасць мыслення, пошук новых выразных сродкаў. На бел. сцэнах паставіў: у т-ры муз. камедыі — «Сірано» С.Пажлакова (1984), «Гуляем у прынца і жабрака» А.Журбіна і «Сільва» І.Кальмана (1986), «Клоп» У.Дашкевіча (1988, паказаны на Усесаюзным фестывалі «Тэатр-88» у Маскве і на 1-м Усесаюзным фестывалі аперэты, музкамедыі і мюзікла ў Адэсе, 1990), «Хэло, Долі!» Дж.Германа (1992), «Халопка» М.Стрэльнікава (1994), «Чараўнік» Д.Рансуінка (1992, Дзіцячы муз. т-р «Казка»); у т-ры оперы і балета — «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана (1989, Дзярж. прэмія Беларусі 1990; паказана на сцэне Вял. т-ра ў Маскве), «Апалон-заканадаўца» Р.Вардоцкага (1989, канцэртная версія), «Кармэн» Ж.Бізэ (1990, 1-я сцэн. версія; паказана на сцэне Вял. т-ра; 1994, 2-я сцэн. версія), «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава (1992), «Іаланта» П.Чайкоўскага (1993), «Сельскі гонар» П.Масканьі (1996). З 1998 працуе ў Расіі.

*Літ.*: Брылон В. Слава для мяне не самамэта // Мастацтва Беларусі. 1991. № 8.

*В.Г.Брылон.*

**«ЦЯРЭ́ШКА»**, «Жаніцьба Цярэшкі», калядная гульня, адна з форм калядна-абрадавага ігрышча моладзі, якая дасягнула шлюбнага ўзросту (25—35 гадоў); найб. яркі прыклад паратэатр. культуры беларусаў у сямейна-абрадавай творчасці. Яе вытокі — у язычніцкім абрадзе, які рэгуляваў стварэнне сямейных пар, адлюстроўваў стараж.-бел. звычай «умыкання» жонак. Гульня «Ц.» не была ўзнаўленнем вясельнага абраду, а ўяўляла сабой трансфармацыю бацькоўскага блаславлення маладых. У ёй знайшлі найб. поўнае адлюстраванне матывы вяселля, шлюбу, шлюбных адносін; насычана тэатралізацыяй і гумарам, пазначана сінкрэтызмам, які праяўляўся ў лаканічным, непарушным спалучэнні розных па прыродзе выразных магчымасцей маст. кампанентаў: драм., вусна-паэт., маторна-харэагр., муз.-песеннага, інструментальнага. Гульня «Ц.» праводзілася на Каляды познім вечарам; магла адбывацца некалькі вечароў запар, пакуль усе пары не былі «пажэнены». Месца правядзення — напачатку карчма, пазней — большая вясковая хата. Удзельнікі: «бацька» і «матка», якія складалі і «жанілі» пары, моладзь, «бабка» і «дзед»; жанчынып-явунні, якія выконвалі адпаведна кожнаму этапу песні-«цярэшкі»; музыкі (адзін выканаўца або ансамбль: дудка, скрыпка, цымбалы, гармонік, бубен, баян) і гледачы, якія актыўна ўдзельнічалі ў гульні. У «Ц.» ўдзельнічалі толькі раз у жыцці. Яна мела мноства варыянтаў, але традыцыйна склаліся асн. этапы развіцця гульнявой дзеі, уласцівая толькі ёй маст.-эстэт. атмасфера. «Ц.» бытавала да сярэдзіны 20 ст. на тэр. Глыбоцкага, Докшыцкага, Міёрскага, Пастаўскага, Полацкага і інш. р-наў Віцебскай вобл., у Барысаўскім, Лагойскім, Вілейскім і Мядзельскім р-нах Мінскай вобл.

*І.А.Алексніна.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ